*АЛЯКСЕЙ РАГУЛЯ*
*(г. Мінск)*

# Скарбонка духу

З прыходам у беларускую тэатральную культуру Міколы Дудчанкі ў нацыянальнай школе рэжысёрскага майстэрства атрымаў сваё завяршэнне новы тып рэжысёра — педагога, арганізатара і пастаноўшчыка эпічнага тэатральнага дзейства па-за сценамі тэатральнай залы.

Беларуская драматургія ў пачатку XX стагоддзя дасягнула значных поспехаў у адраджэнні і развіцці эпіка-філасофскай містэрыі, жанравыя формы якой у *фальклоры* вызначалі каштоўнасную арыентацыю этнасу на працягу тысячагоддзяў, а культурныя рэгулятывы ў час крызісаў кансалідавалі яго творчыя сілы ў пошуках выйсця «на шырокі прастор». Пастаноўкі на Мінскім велатрэку ў 20-х гадах былі, па сутнасці, альтэрнатывай тым відовішчам, у якіх гульня становіцца фабрыкацыяй вызваленых ад культурнага табуіравання «фанатаў».

Сучасныя спробы механічна перанесці паэтыку акадэмічнага тэатра ў стылізаваную прастору паркаў ці садоў нагадваюць, у лепшым выпадку, разумовыя забаўлянкі сібарытаў арыстакратычнага барока ці ракако. У афіцыйных шоу таксама звычайна дзейнічаюць жывыя манекены з грандыёзнымі шпаргалкамі ў руках.

У рэжысёрскай творчасці Міколы Дудчанкі перш за ўсё ўспрымаецца дух свабоды і незалежнасці аўтара ад моднай «постмадэрнасці» і афіцыёзу. Узгадаваны далёка ад Бацькаўшчыны, ён тым не менш нейкім невытлумачальным чынам надзвычай арганічна ўспрыняў уласцівы беларускай народнай культуры дух самасцвярджэння супольнага суб’екта — у формах карнавалу і містэрыі. Стыль народнай культуры не ведае дэманстрацыі — тым больш дэманстрацыі пакоры ці паказной адданасці ўладару, хай сабе на небе ці на зямлі: гэта стыль вечнага ўзнаўлення жыцця. І ў гэтым руху няма сузіральнікаў, бо ўсе, кожны ў меру сваіх магчымасцей і па-свойму, але рушылі ўсе — разам!

Як педагог, Мікола Дудчанка фарміруе ва ўдзельнікаў (найперш фестывалю «Берагіня») унутраную патрэбу ў духоўным яднанні пакаленняў, якія былі і якія ёсць. У купальскім шэсці на рэспубліканскім Рудабельскім Купаллі да вогнішча звычайна энергія супольнасці вырываецца на паверхню ў вербальнай форме маральнага імператыву: ліго! Інакш — у канцэнтраванай форме няпісанага закона, які ператварае натоўпы ў легіёны культурнага фронту. Рэжысёр М. Дудчанка дзейнічае як педагог, які закладвае зарад самастойнасці. Ён добра ведае і адчувае псіхалогію вялікай масы людзей. Яны для яго — не натоўп, які лёгка паддаецца афектам, а *Грамада*, у якой жыве, хай сабе і неўсвядомленая, патрэба *людзьмі звацца*. І гэты зарад людскасці, абуджаны выдатным артыстам і педагогам, стварае атмасферу ўзаемапавагі, адкрытасці, далучанасці асобы да прасветленай сілы ідэалу. У праведзеных М. Дудчанкам фестывальных імпрэзах на рудабельскай «Берагіні» заўсёды ўдзельнічаюць звыш тысячы людзей, дарослых і дзяцей, і ўсе мерапрыемствы праходзяць без парушэнняў грамадскага парадку.

А што да стылю педагагічнага кіраўніцтва, то тут трэба адзначыць выразную і карэктную манеру і патрабавальную форму моўных зносін. М. Дудчанка актыўна карыстаецца камандным стылем, але і тут адчуваецца яго павага да ўдзельнікаў. Менавіта такі стыль «у выкананні Міколы Рыгоравіча» фарміруе пачуццё годнасці, адказнасці і самапавагі ў вучняў, студэнтаў і ў людзей сталага веку.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Акрэсленасць і выразнасць пазіцыі, уласцівыя грамадскім імпрэзам і публічным выступленням М. Дудчанкі па пытаннях семантыкі і сімволікі розных відаў народнай культуры, забяспечаны не толькі дакладным веданнем, але і абвостраным успрыманнем яе вытанчанай духоўнасці, непрыняццем фальшу і падробак пад фальклорную эстэтыку.

У інтарэсах развіцця лепшых традыцый педагогікі і беларускай народнай эстэтыкі, педагагічнай грамадскасці і кіраўнікам устаноў культуры трэба паклапаціцца пра тое, каб педагагічны і культуратворчы вопыт Міколы Дудчанкі быў абагульнены і стаў даступны педагагічнай грамадскасці і работнікам культуры.

*2013, верасень*

*ВЯЧЕСЛАВ СЕМЕНЬКО*

*(г. Минск)*

## Нас выбрало время

С Николаем Григорьевичем Дудченко нас выбрало и сдружило время. Смена руководства страны, приход к власти М. С. Горбачева, провозгласившего «перестройку», потребовали новых подходов в идеологической работе государства, называвшегося гордо — Советский Союз. Аппаратные идеологи всех уровней стали искать формы активизации своей деятельности и выражения нового содержания. И мы оказались втянутыми в этот процесс.

Впервые фамилию Дудченко я услышал в кабинете третьего секретаря Советского райкома партии В. П. Поздняк от режиссера отдела массовых мероприятий Белорусской государственной филармонии В. И. Лейдмана. Он, как и я, был приглашен в райком для оказания профессиональной помощи в подготовке участия района в праздничной демонстрации, посвященной Дню Победы, а также праздничных мероприятий на территории района. Кандидатура Н. Г. Дудченко предлагалась в качестве балетмейстера. Встретились мы с ним чуть позже при проведении праздничных мероприятий на сценической площадке, построенной на ступеньках Белорусской государственной филармонии. Сцена была выполнена в соответствии со сценарным замыслом режиссера и включала два сомкнутых грузовика с откинутыми бортами, на которых крепился длинный транспарант с надписью «Давай закурим!» Площадка была стилизована под образ фронтовой агитбригады. На этой площадке шел концерт, где звучали военные песни и исполнялись хореографические миниатюры, которые талантливо поставил Н. Г. Дудченко. Был май, прекрасная погода, публика воспринимала концерт восторженно.

Я к этому времени окончил кафедру промышленного искусства БГТХИ, четыре года проработал в Белорусском филиале технической эстетики в качестве дизайнера-графика, поступил в аспирантуру БГТХИ и работал над диссертацией. Тема диссертации была направлена на изучение роли графических средств, при проведении массовых театрализованных мероприятий, поэтому крайне интересно увидеть практическую значимость и выразительные возможности графики в комплексе с другими видами искусства. Я убедился, что синтез музыки, хореографии, визуальных средств могут вызывать сильнейшие эмоции у зрителей.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ